Cana 10 hr. Pierasyłka apłačana ryčałtam

Nr. 40 (681). Wilnia, Niadziela 4 Kastryčnika 1936 h. Hod XII (XX)

БЕЛАРУСКАЯ КРЫНІЦА | BIEŁARUSKAJA KRYNICA

Palityčnaja, hramadzkaja i litaraturnaja hazeta.

Adras Redakcyi i Administracyi: WILNIA, ZAWALNAJA 1—1 (Wilno, Zawalna 1—1). Redakcyja adčynlena ad 9 hadz. ran. da 4-aj uwieč.	HAZETA WYCHODZIĆ RAZ U TYDZIEŃ.	Košty wydawańnia pakrywajuć składki. Składka u hod 4 zał., na paŭhoda — 2 zał., na 3 miesiacy — 1 zał.

БЕЛАРУСЫ! Дамагайцеся для сваіх дзяцей школы ў роднай мове — падавайце школьным уладам дэклярацыі на беларускую школу!

Гітлероўская палітыка і Беларусы

Гітлер сваю палітыку і бадай усе свае пляны апрацаваў і разьмяркаваў яшчэ даўно прад тым, як здабыў у Нямеччыне ўладу. Усё гэта ён зрабіў у сваей кнізе «Mein Kampf» («Мая барацьба»). Цяпер дыктатар нямецкі толькі выконвае тое, што раней намеціў. І калі сяньня ён робіць нешта як-бы новае, дык і гэта фактычна ёсьць толькі выснавам таго, што знаходзіцца ў гэнай яго кнізе. Вось-жа ўглыбіўшыся ў тэорыю Гітлера, лёгка можна так-жа зразумець, якія пагляды і адносіны яго і да беларускага народу.

Калі тут гаворым аб гітлероўскай палітыцы, дык, зразумелая справа, маем на ўвазе прадусім яго палітыку загранічную і яго адносіны да суседніх і агулам народаў і яго на гэтыя справы пагляды. Аб гэтым усім дужа шмат чаго для нас цікавага знаходзім у ўспомненай кнізе Гітлера, а так-жа ў ягонай сяньнешняй палітычнай практыцы, якая, як мы ўжо сказалі, ёсьць верным адбіцьцём гэнай кнігі. У кнізе „Mein Kampf“ між іншым выражаецца ідэя абавязкавай патрэбы нямецкай экспансіі на ўсходнія славянскія і надбалтыцкіх народаў землі. Ясна, што гэта нямецкае імкненьне датыча і зямель беларускіх. І сапраўды, быў час — гэта было яшчэ прад нямецка-польскім трактатам — калі ў нямецкіх газэтах нават пісалася аб тым, што нямецкая палітыка ў будучыне на ўсходзе Эўропы створыць нейкую вялікую фэдэрацыю вольных народаў. Сярод гэных народаў быў-бы так-жа і наш народ беларускі. Чытачы нашы гэта пэўна прыпамінаюць, бо аб гэтым у сваім часе «Бел. Крыніца» ў парадку інфармацыйным пісала. Вось-жа, што гэта была-б за фэдэрацыя і якая ў ёй была-б свабода народам, можна дагадацца з наступнага, што мы падаём за газэтай «Robotnik».

У Ліхэн пад Бэрлінам існуе «Палітычная Школа ім. Адольфа Гітлера». Ідэовы характар і мэты гэнай школы даюць нам яснае паняцьце аб адносінах Гітлера і яго тэорыі да народаў. Школа гэна — гэта некалькамесячныя курсы. Адбываюцца яны такім спосабам, што выдатныя гітлероўскія партыйныя дзеячы маюць рэфараты, над якімі пасьля бывае дыскусія. У праграме «навукі» гэных[x] курсаў знаходзяцца гэткія пункты: 1) нямецкія адносіны да народаў, маючых расовую вартасьць і 2) адносіны да народаў у сэнсе расовым менш вартасных. Да першых дараджаецца прыязьнь, а да другіх трэба адносіцца выключна паводле інтарэсу і часовай патрэбы, як напрыклад адносіны да Польшчы і трактат з ёй.

Бліжэй гітлероўцы гэну сваю тэорыю разьвіваюць гэтак: Палякі належаць да нізкай расы, а гэта прадусім затым, што гэты народ знаходзіцца пад сільным уплывам чужых расаў. Французы яшчэ менш вартасныя ў сэнсе расовым, бо ў калёніях французы масава мяшаюцца з насельніцтвам каляровым, а француская палітыка гэтаму сусім не перашкаджае.

Няменш так-жа цікава, як падае той-жа „Robotnik“, выглядае і гітлероўская практычная палітыка, апёртая на гэткай «навуцы», якую выкладаюць у успомненай палітычнай школе. І так: 1) Нямецкая ўсходняя палітыка імкнецца да таго, каб здабыць надбалтыцкія краі, а так-жа польскія абшары, што прад вайной належылі да Нямеччыны. Трактат з Польшчай можа быць сарваны раней, не чакаючы сканчэньня дзесяцілетняга тэрміну. Што да Расеі, дык трэба асягнуць прынамсі Украіну, але ня можна не дацэньваць сілы і вартасьці савецкай арміі. 2) Справу «Anschlussu» (аб'яднаньня) з Аўстрыяй займаюцца палітыкі, якія стаяць найбліжэй да Гітлера. Нядаўна падпісанае паразуменьне між Нямеччынай і Аўстрыяй ёсьць аднэй із азнакаў дасьпяваньня гэтай справы. 3) Дзяржава Чэхаславацкая ня мае рацыі быту і мусіць быць падзелена. З нямецкіх там зямель славянскае насельніцтва мусіць быць выгнана, каб можна было пасяліць там чыстакроўных немцаў. 4) На захадзе, немцы прынцыпова не выракаюцца Альзацыі і Лётарынгіі, але покульшто ўдаюць, што гэтая праблема для немцаў цяпер неактуальная. Тое-ж самае адносіцца да бэльгійскага абшару Эўпэн-Мальмэды. Трэба аднак прапагаваць ідэю гітлерызму і расізму ў Альзацыі, Люксэмбургу, Галяндыі і Бэльгіі. З гэтага можна мець паняцьце, як гітлерызм адносіцца да беларусаў і да нашых земляў.

Шмат чаго так-жа нас вуча і адбыты нядаўна ў Норымбэрзе кангрэс гітлероўцаў, на якім апрача нябывала вострай варожасьці да СССР, рашуча так-жа была высунута і справа здабыцьця для Нямеччыны, аднятых ад яе па вайне, калёніяў.

Вось-жа ня трэба забывацца, што ў гітлероўскай тэорыі гэткімі нямецкімі калёніямі зьяўляюцца ня толькі землі людзей каляровых недзе ў Афрыцы ці Азіі, але так-жа і землі беларускія.

З гэтага ўсяго відаць ясна, чаго варта гітлероўская тэорыя сама ў сабе, а так-жа ў адносінах яе як тэорэтычна, так і практычна да беларускага народу. Тымчасам ёсьць у беларусаў некалькі адзінак — дaслоўна толькі некалькі, — якія «ор'ентуюцца» ня то што на гітлероўскую тэорыю, але нават на гітлероўскую практычную палітыку і кажуць, што ў Гітлеры яны бачаць збаўленьне для беларускага народу. Але „нявіннасьць“ такіх палітыкаў і іх палітыкі настолькі празрыстая, што можна толькі пацiснуць плячыма і перайсьці над ёй да парадку дзеннага.

Сяньня павінна быць ясна кожнаму беларусу, што ніякія ор'ентацыі не вядуць беларускі народ да ягонай мэты апрача аднэй: гэта апрача ор'ентацыі на свой уласны беларускі народ...

Больш асьветы агульнай і — фаховай!

(З нагоды 50-га нумару „Самапомачы“).

Сёлета ў м-цы верасьні выйшаў ужо 50 нумар месячнага беларускага коопэратыўна-гаспадарчага часапісу „Самапомач“, у каторым, між іншым, знаходзім пад вышэйпаданым загалоўкам цікавы і важны артыкул, які ніжэй поўнасьцю перадрукоўваем.

„Радасьць бярэ, калі чуваць з усіх кутоў нашага Краю, як людзі нашы дружна дамагаюцца для сваіх дзяцей беларускай школы. Сум агартае, калі даходзяць весткі аб тым, з якімі труднасьцямі і ахвярамі зьвязана гэта дамаганьне. Урэшце, вера неперамажная ў слушнасьць нашых дамаганьняў дадае сіл да дальшае працы ў гэтым кірунку, аж пакуль беларускае дзіця будзе магчы вучыцца так, як і дзеці ўсіх іншых народаў, у школе сваей роднай, г. зн. **б е л а р у с к а й**.

Гэта ясна. Але на гэтым не канец. Найлепшыя і найхутчэйшыя рэзультаты пачатай школьнай акцыі ня ў сілах адразу здаволіць нашы народныя патрэбы ў галіне асьветы. Тымбольш, калі гэтыя рэзультаты так ружова зусім не прадстаўляюцца. У гэткіх варунках канешнасьцю ёсьць **асьвета пазашкольная** агульная і — **фаховая**.

Нічога ня дзеецца само праз сябе. І самаасьвета, калі мае абняць больш людзей і даць ім паважнейшую карысьць, павінна быць кіраванай **з аднаго супольнага месца**. Для сталай лучнасьці такога ўмоўнага цэнтру з кожным самаасьветным кружком і нават кожнай асобнай фізычнай адзінкай патрэбны асобны часапіс...

У самаасьвеце фаховай, у нашым выпадку — ў гаспадарча-земляробскай, гэткі часапіс выходзіць вось ужо 50-ты раз. Пяцьдзесят нумароў нашай „Самапомачы“ за чатыры гады, гэта пяцьдзесят натугаў кінуць у нашу беларускую вёску думку гаспадарчага дабрабыту, апертага не на чыейсь помачы з-боку, але на выкрэсіваньні сіл з нутра самага народу. Цяжкая гэта праца, асабліва, калі побач насаджваюцца і ўтрымоўваюцца чужыя пляцоўкі, ня гэтулькі гаспадарчыя, колькі конкурэнцыйныя, сыта падтрымліваныя з розных бакоў і гадуючыя пракананьне якраз адваротнае — што ў гаспадарчым значэньні мы быццам заўсёды будзем змушаны на некага аглядацца.

Па 50-цёх нумарох можам аднак выказаць здаваленьне, што праца наша марнай ня была. Здаём сабе справу, што і гэта скромная праца магла-б быць далёка пладнейшай, калі-б было да працы больш адпаведна — прыгатаваных людзей. Выказываныя колькі раз некаторымі нашымі чытачамі і супрацоўнікамі пажаданьні, каб часапіс пашырыў свой разьмер, або часьцей — прынамсі што другі тыдзень — выходзіў, — дагэтуль, на жаль, не маглі быць выкананы: каб гэта правесьці ў жыцьцё, трэба каб часапіс у дагэтуляшнім фармаце быў самааплачальным. Датуль-жа, пакуль выдавецтва да кожнага нумару змушана даплачываць—няхай ніхто ня згоршыцца гэтым прызнаньнем!—датуль ня можна вымагаць зьмен у кірунку пашырэньня.

Але думаць аб пашырэньні трэба. Кожны да гэта павінен прылажыць руку: хто можа — супрацоўніцтвам у рэдакцыі, прысылаючы свае увагі ці апісваючы свой спосаб гаспадаркі; хто чытаньнем часапісу ў адзіночку і асабліва ў гуртку людзей знаёмых, хто праводзячы ў гаспадарцы рады апісаныя ў часапісе, урэшце — рабіць гэта можа і мусіць кожны! — зьбіраньнем падпіскі на адзіночныя нумары і асабліва на выгодныя **дзесяткі**. — Усё гэта рэчы магчымыя і вельмі, вельмі патрэбныя. Сама рэдакцыя ўсей гэтай работы выканаць ня можа. Да гэтага патрэбна супрацоўніцтва ўсіх чытачоў. А як гэта станецца, тады й часапіс пабольшыцца, бо старая гэта праўда, што **часапіс заўсёды бывае такім, на які заслугоўваюць ягоныя чытачы**.

Дык, чытачы „Самапомачы!“ У сваім собскім інтарэсе, у інтарэсе чэсьці, усе да супрацоўніцтва, а праз гэта і **да фаховай земляробскай асьветы!**“

Камуністычная Партыя Беларусі ў большасьці небеларуская

Ведаем, якую мела ўладу ў СССР камуністычная партыя дасюль агулам і якую адыгрывала ролю ў грамадзка-палітычным жыцьці, а такжа і ў жыцьці нацыянальным, кожная краёвая — „нацыянальная“, калі-б можна было гэтак назваць, камуністычная партыя саюзнай „нацыянальнай“ рэспублікі, уваходзячай у СССР.

У праекце новай канстытуцыі СССР гэтае права для камуністычнай партыі так-жа абазначана. У гэтым праекце канстытуцыйнага закону выразна сказана, што камуністычная партыя зьяўляецца перадавым органам працоўных і кіраўнічым асяродкам усіх арганізацыяў, як грамадзкіх, так і дзяржаўных.

З гэтага бачым, што і далей будзе кіраваць камуністычная партыя грамадзка-палітычным жыцьцём у СССР, у які ўваходзіць і БССР.

БССР, як нацыянальна-саюзная рэспубліка, мае і сваю краёвую камуністычную партыю, якая зьяўляецца перадавым органам працоўных і кіраўнічым асяродкам усіх арганізацыяў, як грамадзкіх, так і дзяржаўных у Савецкай Беларусі.

Беларускія народнікі ня раз, але ўсьцяж робяць закід камуністым, што ў Савецкай Беларусі беларусы адсунуты на апошняе месца.

Гэты закід пацьвярджае цяпер і савецкая прэса.

„Зьвязда“ (орган Ц.К. Камуністычнай Партыі Беларусі) у нумары 217 з 21 верасьня сёл. абгаварваючы недахопы Камуністычнай Партыі Беларусі, між іншым, падае наступнае:

— У Віцебскай партарганізацыі з 35 сакратароў парткомаў буйных прадпрыемстваў і навучальных установ беларусаў толькі 9 чалавек; сярод первічных арганізацыяў беларусаў толькі 40 проц. — Сярод дырэктараў буйных прадпрыемстваў беларусаў толькі 18 проц.; тое самае і з прафработнікамі. — У фабрыках і заводах Віцебшчыны сярод работнікаў беларусы становяць 70 проц.

З гэтай статыстыкі бачым, што на вышэйшых становішчах у Віцебшчыне ў абсолютнай большасьці небеларусы-чужынцы, а беларусы у абсолютнай большасьці на становішчах ніжэйшых — „радавыя“ работнікі — „чорнарабочыя“.

Далей „Зьвязда“ падае, што аналягічныя факты маем і ў горрайкомах Менскай партарганізацыі:

— У Варашылаўскім раёне ў рэзэрвах на кіраўнічыя становішчы беларусы становяць толькі 34 проц.; — у Сталінскім раёне сакратарамі первічных партарганізацыяў беларусы становяць толькі 20 проц.

Апрача гэтага, вельмі малы процант беларусаў і на шляху ў рады камуністычнай партыі, а гэтым самым і на шляху да вышэйшых, адказных становішчаў. Аб гэтым „Зьвязда“ падае наступнае:

— у Віцебшчыне, на фабрыцы „Профінтэрн“ сярод спачуваючых (кампартыі — рэд.) беларусы становяць 34 проц.; — у Менскім раёне, на галянтарэйнай фабрыцы імянем Куйбышава беларусы работнікі становяць 50 проц., а ў групе спачуваючых — беларусаў толькі 25 проц.

З вышэйпаданага відаць, што рашаючы голас у паданых мясцох, у апісаных галінах жыцьця, мае нейкая небеларуская большасьць на вышэйшых становішчах, бо беларусы ўсюды там у меншасьці.

Трэба ведаць, што беларусы ў меншасьці і ва ўсей камуністычнай партыі Беларусі.

Мы ведаем, што як у СССР, так і ў БССР камуністычная партыя — гэта як-бы сувэрэн, на якім апіраецца дзяржава і які зьяўляецца жаралом права. Але-ж гэты „сувэрэн“ складаецца з жывых і думаючых людзей, якія ў БССР у большасьці не беларускі, а нейкі чужы.

Словам, беларусы ў беларускай нацыянальнай рэспубліцы на кіраўнічых і адказных становішчах становяць меншасьць, а Камуністычная Партыя Беларусі ў большасьці небеларуская.

Я. Лугавец.

Knihapis

Paprocki S. J.: **Minority Affairs and Poland**, bač. 184, Waršawa 1935.

Anhlicki tytuł wyšmienawanaj knižki ŭ pierakładzie na biełaruskuju mowu znača „Sprawy nacyjanalnych Mienšaściaŭ i Polšč“. Jak asoba aŭtara, tak i instytucyja wydaŭca („Daśledčy Instytut Nacyjanalnych Mienšaściaŭ u Waršawie“) sami za siabie jasna kažuć, što heta za knižka i pašto jana wydana: kab u *dziaržaŭna-polskim* aświatleńni pakazać žyćcio hetak zwanych nacyjanalnych mienšaściaŭ — u tym liku i Biełarusaŭ — u Polščy. Knižka heta, jak i mnoha-mnoha inšych u hetym rodzie, pradznačana dziela prapahandy Polščy zahranicaj.

Hetkaha rodu prapahandnaj litaratury mnohija dziaržawy kidajuć masami na mižnarodny knižny rynak, často pa toje, kab zahłušyć, zacierci sapraŭdnaść i pakazać peŭnyja „niawyhodnyja“ sprawy ŭ światle, karysnym dla wydaŭcoŭ. Treba ściwierdzić adnak z zadawaleńniem, što siahońnia ŭžo ludzi dawoli dobra adroźniwajuć miakinu ad ziarniaci i kožnaje z ich nazywajuć pa imieńni.

Ab knižcy p. Paprockaha Waršaŭski anhlicki tydniowik „*The Warsaw Weekly*“ (№ 37) pieradrukoŭwaje z peŭnaha amerykanskaha časapisu miž inšym nastupnyja ŭwahi: „Daśledčyk pytańnia nacyjanalnych mienšaściaŭ znojdzie ŭ hetaj małoj knižcy karysny narys ab hrupach nacyjanalnych mienšaściaŭ u Polščy z punktu hledžańnia ŭradu. Razhledžany tut piać hałoŭnych hrup: Ukraincy, Biełarusy, Litoŭcy, Niemcy i Žydy... U padawańni ličby kožnaj nacyjanalnaj („mienšaściowaj“) hrupy padajucca biez zaściarohi ličby z pierapisy 1931 h., choć kožny abznajomleny z warunkami, pry jakich hety pierapis adbywaŭsia, wiedaje, što hetyja ličby zusim nierealnyja i što mohuć uważacca tolki jak minimalnyja. Poŭaficyjalny charaktar hetaj knižki widać z uwodnaha ćwierdžańnia, što „hetyja hwarancyi (u kanstytucyi i zakanadaŭstwie paślawajennaj Polščy) zusim wystarčajuć dziela zabiaśpiečańnia poŭnaha raźwićcia, praŭnaj i faktyčnaj roŭnaści prawoŭ usich hramadzian Respubliki, biaz uwahi na roźnicy nacyjanalnaj prynaležnaści“.

Uwodnaja časć knižki tłumača zaściarohi Polščy adnosna razroźniwańnia abniataha dahaworam ab nacyjanalnych mienšaściach, katory musili padpisać u Wersali tolki mienšyja dziaržawy: Polšč (pawodle aŭtara knižki — A. K.) nie zrakłasia hetaha dahaworu ŭ 1934 h., ale tolki ściwierdziła, što nia budzie wiazacca hetym dahaworam datul, pakul jon nia budzie ahulnym dla ŭsich dziaržaŭ (h. zn. dla Niamieččyny i mahčyma dla Rasiei).

Hetulki ab wyšmienawanaj knižcy i ab pałažeńni h. zw. nacyjanalnych mienšaściaŭ u Polščy piša niechta Richard Hartshorne (Uniwersity of Minnesota). Jak widać, dalokija amerykancy ŭ niekatorych našych sprawach aryjentujucca zusim dobra i dla ich „nawučnaj“ litaratury „ab mienšaściach“ zusim nia treba. Dyk ci nia lepš by było, kab choć častka padatkawych hrošaŭ, jakija iduć na darahuju zahraničnuju prapahandu, była škirawana na... aświetu choć-by samych Biełarusaŭ, jakija tak ciažka i achwiarna dabiwajucca swaje rodnaje škoły?!

Pry kancy treba zaŭważyć, što aŭtar knižki — i wyšmienawanaj recenzii — dla aznačeńnia Biełarusi i Biełarusaŭ užywaje termin „White—Ruthenia“, „White—Ruthenians“, zamiest dwuznačnaha dla zahraničnaha wucha terminu „White Russia“, „White Russians“, jaki spakušaje razumieć praz heta: „biełych rasiejcaŭ“ ci jnakš — „biełahwardziejcaŭ“ (aŭtar nazywaje termin „White Russia“ „abmyłkowym tłumačeńniem uwiedzienym pieradwajennaj rasiejskaj prapahandaj“). Tak ci jnačaj, ale ŭwiadzieńnie terminu „White Ruthenia“, na siahońnia prynamsia, treba pryznać ščaśliwym.

A. K.

КУПЛЯЙЦЕ адзіны ў нас беларускі літаратурна-навуковы квартальны часапіс

„К А Л О С Ь С Е“,

у якім зьмяшчаюцца творы перадавых беларускіх паэтаў і пісьменьнікаў.

Складка на „Калосьсе“: у год — 2 зл. на паўгода — 1 зл., на асобную кніжку — 50 гр.

Адрас рэдакцыі і адміністрацыі „КАЛОСЬСЯ“:

Вільня, Завальная вул. № 1—2.

Др. Ст. Грынкевіч.

2)

У братоў украінцаў.

„П Р О С В І Т А“.

Кожны дасьледчык, ці на‘т толькі госьць, які больш звважным вокам глядзіць на падзеі украінскага народу ад пачатку ягонага Адраджэньня, ня можа ня спыніцца над двама стаўпамі адраджэнскае працы, а мяноўна над „Просвітаю“ і „Рідною Школаю.“ Можна казаць, што падзеі гэных дзьвёх установаў у вялікай меры былі падзеямі змаганьня украінскага народу за сваю лепшую будучыню ў межах Галіччыны а на‘т часткова і ўсяе вялікае Украіны. „Просвіта“ і Рідная Школа пачыналі сваю працу ў неаднолькавых умовах, цікавілі яны аб іншых старанах жыцьця і разьвіваліся быццам незалежна адна ад другое. Бачым, праўда, тыя самыя прозьвішчы сярод працаўнікоў абедзьвюх установаў, аднак дасюлешняя запісаная гісторыя разглядае іх чамусьці асобна, прычым на‘т можна пабачыць праявы нейкай супярэчнасьці ў разуменьні ранейшае ролі, згулянае ў мінуўшчыне. Бязумоўна чужому наглядчыку шмат цяжэй паказаць беспамыльна на розьніцы ў паасобных установах, цяжка сказаць, хто больш папрацаваў на карысьць свайго народу, дык нам трэба было-б разглядаць падзеі гэныя бяручы іх супольна. Дзеля аднак яснасьці, каб лягчэй было ўявіць тыя шляхі, якімі ішоў украінскі народ у сваім адраджэньні, разгледзім кожную арганізацыю асобна.

Доля ўкраінскага народу, якая мае гэтулькі яркіх, прыгожых мамэнтаў у мінуўшчыне, штораз паказываецца нам настолькі цяжкою і непрагляднаю, што сапраўды можна параўняць яе толькі з нашаю беспатольнаю доляю беларускаю. Прыпомнім толькі аканчальны падзел украінскага народу ў XVIII стагодзьдзі паміж дзьвяма тагачаснымі вялікімі дзяржавамі Расеяю і Аўстрыяю. Якое было ўкраінскае жыцьцё з гледзішча нацыянальнага ў колішняй царскай Маскоўшчыне ведаем, ці прынамся лёгка можам уявіць, па аналёгіі з доляю сялянскіх масаў беларускіх. Прыгон аж да 1861 г., нястача свае роднае інтэлігенцыі, якая амаль зусім была адыйшла ад сваіх масаў. Мо‘ крыху было яно лепш з украінцамі чымся ў нас, аднак тыя нялікія адзінкі сярод паноў-шляхты, якія наштодзень гаварылі „папростаму,“ мала чым адыходзілі ад нашых беларускіх паноў, што гаворачы пабеларуску ўмелі ня горш за іншых прыдушыць прыганятага мужыка. Адно толькі што зямля у іх слаўная, лягчэй магла пракарміць свайго сына.

Крыху былі іншыя ўмовы ў Аўстрыі. Да Аўстрыі лучылі ў вялікай масе уніяты грэка-каталікі (Галіччына, Закарпацьце) і ў меншай колькасьці праваслаўныя на Букавіне. Ініцыятыва да нацыянальнае работы выходзіла праз увесь час з Галіччыны, дзе веравызнаньне адыграла вялізарную ролю. Дзякуючы загадам цэсарыцы Марыі ды цэсара Язэпа II, была заведзена навука ў сэмінарыі грэка-каталіцкай ў Львове „паруску,“ а па ўсіх цэрквах набажэнства ў роднай мове насельніцтва побач славянскай мовы. Раней па цэрквах, як гэта было і на беларускіх землях, украінская мова была пачала выціскацца польшчынаю. Родная мова ў сьвятынях не дала адчужаніцца духавенству, якое адыграла вызначную ролю ў змаганьнях украінскага адраджэньня. Прадстаўнікоў грэка-каталіцкага духавенства бачым ад пачатку да апошніх дзён і ў роднай краіне і на эміграцыі ў першых радах змагароў за лепшую долю свае Бацькаўшчыны.

* * *

Год 1848, які быў адною з тых ясных зорак на шляху чалавецтва са сваімі лёзунгамі свабоды, гэны год, які толькі ледзь-ледзь закрануў нашае Адраджэньне, пакінуў вялікія сьляды ў Галіччыне. Гэны год быў адначасна канцом прыгону ў Аўстрыі. Паасобныя народы аўстрыяцкае імпэрыі пачалі крыху лепшае жыцьцё. Вось 1848 г. скрануў, калі і не масы украінскія, дык лепшую частку інтэлігенцыі і духавенства. Гэній Шэўчэнка, сьляды працы ў Галіччыне ахвярнага Шашкевіча Маркіяна былі крыніцамі сьведамага пачуцьця супольнасьці ў вялікім украінскім народзе. Народ быў масаю, якая горача трымалася свайго роднага, трымалась аднак толькі інэртна. Ня было над народам працы.

З мэтаю працы над народам было заснована ў 1848 годзе асьветнае таварыства — за прыкладам сэрбскае матыці (1826), чэскае матыці (1830) — пад назоваю **„Галіцка руская матыця.“** Быў пабудаваны за шырока народныя грошы **Народны Дом** у Львове. Вельмі хутка аднак пачынаецца разыходжаньне сярод інтэлігенцыі і павадыроў тагачасных. Шмат хто напалоханы больш жорсткім курсам аўстрыяцкае палітыкі пачынае сумлявацца, ці сапраўды украінцы (на тую пару назова украінцы была менш распаўсюджана, галіцкія украінцы называлі сябе вельмі часта русінамі) скалыхнуць цёмную масу сялянства. Небясьпека палёнізацыі казала шмат каму на‘т са сьвядомых адзінак, а толькі палахлівых людзей, глядзець на Маскву як на адзіную заступніцу пакрыўджаных славян.

Да таго-ж і ў народзе маскоўцы мелі не малую сымпатыю. Народ пазнаёміўся тады з расейскімі жаўнерамі, што йшлі у паход на вайну з мадзярамі ў 1848-49 г.

Так пачалося масквафільства ў Галіччыне, якое зусім праўда абнядужанае і нялікае, датрывала да нашых дзён. Масквафілы, ці інакш, як яшчэ іх называлі старарусы, мелі ў сваіх руках пакліканыя да жыцьця ў 1848 г. установы (матыця, народны дом). Дзеля гэтага тая нялікая інтэлігенцыя, якая асталася вернаю самастойным нацыянальным ідэалам, пастанавіла паклікаць новую ўстанову з мэтаю асьветнае працы. Гэнаю вось установаю і была „Просвіта.“ За два гады украінцы сьвяткавацімуць 70 гадоў ад закладзінаў „Просвіты“ (пачатак „Просвіты“ ў 1868 г.).

Коратка абвешчаная мэта новага таварыства была такая: „распаўсюджываць народную асьвету ў народзе ў напрамку маральным, матарыяльным і палітычным выдаючы кніжкі, брашуры ў той мове, якою народ гаворыць.“ Закладчыкі стаялі на тым становішчы, што толькі асьвечаная адзінка можа быць сьвядомым грамадзянінам а толькі сьвядомы грамадзянін будзе фундамантам нацыянальнае індывідуальнасьці. Трэба падчыркнуць, што ад самага па-

З БЕЛАРУСКАГА ЖЫЦЬЦЯ

Справа арганізацыі „Саюзу Беларускіх Пісьменьнікаў“. Малады беларускі паэт Максім Танк, а за ім іншыя закранулі ў прэсе справу арганізацыі беларускіх пісьменьнікаў. Гэта справа сталася сярод беларускіх паэтаў і публіцыстаў актуальнай і ўжо зроблены захады дзеля сарганізаваньня гэтага саюзу.

Сапраўды пара аб'яднацца беларускім пісьменьнікам і супольна праяўляць магчымымі спосабамі сваю творчасьць да ведама ў шырэйшым засягу.

З музыкальнай творчасьці. Ведамы кампазытар праф. Галкоўскі ўлажыў і прыгатаваў да друку дзьве музычныя вязанкі беларускіх мэлёдыяў: першая пад назовам — „Дуда“, другая — „Каханьне“. Гэта багатыя музычныя творы пастаўленыя на хор і аркестру беларускія народныя песьні з пабудоўкай музыкі на мэлёдыях песьняў.

Цяпер астаецца толькі выдаць гэтыя творы друкам.

Йзноў суд. 25 верасьня сёлета Віленскі Гарадзкі Суд разглядаў справу рэдактара Я. Пазьняка, абвінавачанага за зьмяшчэньне ў „Б. Крыніцы“ артыкулу п. н. «Разгон Зьезду Рады БХД“ і інш. У рэзультаце расправы рэд. Я. Пазьняк засуджаны на 4 тыдні арышту і 50 зл. штрафу. Грам. Пазьняк падаў апэляцыю.

Зьмена дырэктара Віленскай Беларускай Гімназіі. Ад 1 г. м. дасюлешні дырэктар Беларускай Філіі Дзярж. Гімназіі ім. Ю. Славацкага ў Вільні Р. Астроўскі пераведзены ў Лодзь. Дырэктарам гімназіі назначаны вучыцель лаціны грам. Анцукевіч.

10-lećcie litoŭskaha radyjo

Užo minuła 10 hadoŭ isnawańnia i pracy litoŭskaha radyjo. Z hetaj nahody 12—14 minułaha miesiaca sioleta hetaje radyjo swaje hetyja ważnyja ŭhodki ŭračysta światkawała. Z dakładaŭ, zroblenych na hetym światkawańni, dawiedwajemsia ab historyi i dziejnaści litoŭskaha radyjo.

Pieršaja radyjostancyja była ŭ Koŭnie naładžana ŭ 1919 h. Była jana adnak jašče duža niedaskanalnaja.

Budowa ciapierašniaj radyjostancyi raspačata ŭ 1923, a skončana ŭ 1926. Pastanoŭka jaje i ŭsio naładžańnie kaštawała 525 000 litaŭ.

Ad hetaha času lik radyjoadbiernikaŭ uściaž pawialičwaŭsia. I tak: u 1926 h. było ich — 323, u 1927 — 5.670, u 1928 — 10,528, a ŭ 1936—30.441. Znača, za 10 hadoŭ lik abonentaŭ (radyjoadbiernikaŭ) pawialičyŭsia badaj u sto razoŭ. Ale heta lik abonentaŭ, a słuchačoŭ ahułam musiła być jašče ŭ niekalki razoŭ bolš.

A z pawialičeńniem liku słuchačoŭ, palapšałasia i stawałasia bolš roznajakaj i prahrama, rasło radyjo značeńnie ŭ žyćci dziaržaŭnym, narodnym i kulturnym. Siańnia litoŭskaje radyjo stałasia mahutnym srodkam uzhadawańnia i kultury.

Ciapier litoŭskaje radyjo ŭ Koŭnie starajecca abniać usie dzialanki žyćcia i zdawolić, skolki možna, jak najbolšy lik słuchačoŭ. Dla hetaj mety praznačany čas wykarystwajecca dla referataŭ, kancertaŭ, opery, baletu, nabaženstwa, teatru, wiestkaŭ, kroniki, dla roznych uračystaściaŭ i h.d.

Praz 10 hadoŭ litoŭskaja radyjostancyja ŭsiaho pracawała 18.779 hadzin. Ahułam biaručy, kožnaja hadzina kaštawała 100 litaŭ. Adnej tolki elektryčnaj enerhii wykarystana na 1.877.000 litaŭ. Śpiarša swaich hrošaŭ radyjostancyi nie chapała i ŭrad dapłačwaŭ joj štohod 150.000 litaŭ. Ciapier adnak jość jana samawystarčalnaj i da taho daje dachod dziaržawie.

Ab „Kresach Wschodnich“

Nadowiačy ŭ Waršawie adbyŭsia nawukowa-daśledčy źjezd, paświačany ŭschodnim ziemlam Polščy. Źjezd adkryŭ ministar wajskowych spraŭ hien. Kaspšycki. Jon, miž inšym, skazaŭ, što ŭžo dwa hady pracuje specyjalnaja kamisija dziela nawukowych daśledaŭ hetych ziamiel u kantakcie z nawukowymi ŭstanowami wyšejšych škołaŭ Waršawy, Wilni, Krakawa i Lwowa, kab dziaržaŭna-nacyjanalna, cywilizacyjna-kulturna misija mieła na čym apiorcisia. Zadańnie hetaj misii wialikaje i nie ciarpić adkładu. Hetyja daśledy ŭ niekatorych abwodach abniali ŭsiu ŭschodniuju terytoryju, a ŭ niekatorych ahraničylisia da Paleśsia i Karpat. Naŭpierad idzie ab toje, kab paznać objektyŭnuju sapraŭdnaść.

U hetym źjeździe brali ŭčaście pradstaŭniki roznych ministerstwaŭ i wyšejšych škołaŭ, a tak-ža roznych polskich hramadzkich arhanizacyjaŭ.

Samaŭradawyja wybary ŭ Łodzi

U niadzielu 27.IX adbylisia ŭ Łodzi wybary ŭ Haradzkuju Radu. Frekwencyja hałasujučych była wialikaja — hałasawała bolš 75 proc. wybarščykaŭ. Wyniki hałasawańnia takija: P.P.S. i profsajuzy 95.185 hałasoŭ — 34 mandaty, endeki 77.919 hałasoŭ— 27 mandataŭ; Abjednany žydoŭski blok 14.937 hałasoŭ — 3 mandaty; Bund i Paalej Sion lawica 23.692 hałasoŭ—6 mandataŭ; Sionistyčny blok 10.601 hoł. — 2 mandaty. Na inšyja ŭhrupawańni, jakija nie atrymali mandataŭ addana 34.233 hałasy.

Endeki, jakija mieli ŭ papiaredniaj Radzie bolšaść, ciapier prajhrali na karyść lawicy.

Konserwatyŭny krakaŭski „Čas“, apiswajučy hetyja wybary, pastrašaje polskuju apiniju „frontam ludowym“, jaki byccam zarysawaŭsia ŭ samaŭradawych wybarach u Łodzi.

Reforma waluty ŭ Francyi i Šwajcaryi

U wialikim sakrecie francuski ŭrad pryhataŭlaŭsia da reformy swajej waluty. Nie zważajučy, što premjer Blum spačatku zapeŭniaŭ ab niaźmiennaści finansawaj palityki, adnak 27.IX. było abwieščana ab dewaluacyi franka. Paśla abwieščańnia ŭradawaj pastanowy ŭ hetaj sprawie, francuski parlamant wydaŭ specyjalny dewaluacyjny zakon.

Da hetaha francuski ŭrad byŭ zmušany nutranym pałažeńniem — masawym adpływam zołata z Francyi, a haspadarčy stan pry dasiulešnim kursie franka byŭ zahrožany katastrofaju.

Kab nie narušyć padstaŭ dalejšaj finansawaj palityki, francuski ŭrad dahawaryŭsia z Amerykaj i Anhlijaj, što hetyja dziaržawy nia pojduć u dewaluacyjnyja pierahonki z Francyjaj i swajej waluty abnižać nia buduć.

Dewaluacyja, prawiedziena francuskim uradam, wyklikała ŭ świecie wialikaje ŭražańnie. Frank abnižany na 30 proc. Zysk z hetaj abnižki astaniecca ŭ kasach francuskaha skarbu.

Za prykładam Francyi pajšła i Šwajcaryja, jakaja tak-ža prawiała ŭ siabie abnižku cany swajej waluty.

Polskija zbližanyja da ŭradu i ekanamičnyja kruhi zapeŭniajuć, što dewaluacyja franka nie hrazić finansawaj stojkaści ŭ Polščy, bo polski handal z Francyjaj niewialiki. Polšč sioleta wiasnoj zawiała dewizowyja ahraničeńni, jakija zusim zabieśpiačajuć ad zachistańnia złoty.

„Worah Nr. 1“

Usia suświetnaja presa abhawarwaje kanhres niamieckich nac. socyjalistaŭ, jaki niadaŭna adbyŭsia ŭ Norynberzie. Anhielski liberalny „Star“ piša: skazanyja ŭ Norynberzie pramowy wiaduć da fantastyčnaha raźbićcia Eŭropy na dwa abozy. Hetki padzieł byŭby supiarečny z pryrodaj, etnolohijaj, z hieohrafijaj, relihijaj i zdarowym rozumam. Francuski publicyst K. Morra piša: hitleryzm i hiermanizm — heta worah Nr. 1. Nawat rasiejskija balšawiki mienš niebiaśpiečnyja dla Francyi, jak anarchija zdyscyplinawanaj, zmilitaryzawanaj i sprusačanaj Niamieččyny. Francuskaja hazeta „Echo de Pari“ piša: Hitler bolš dumaje ab napadzie na Francyju čymś na SSSR. Jon wykarystwaje mižnarodny kamunizm dla swaich palityčnych metaŭ. Jak Lenin wyjaždžaŭ z Berlina ŭ Maskwu, taksama Hitler wysyłaje ŭ Paryž niebiaśpiečnych anarchistaŭ dziela sarhanizawańnia rewalucyi ŭ Francyi.

Prociŭsawiecki blok

Na čale Niamieččyna z Japonijaj.

Zahraničnyja hazety padajuć: niamiecki pasoł fon Dirksen wiarnuŭsia z Berlina ŭ Tokijo. Z hetaj pryčyny razyšlisia čutki ŭ palityčnych kruhoch, što maje paŭstać suświetny prociŭsawiecki blok na čale z Niamieččynaj i Japonijaj.

Dirksen dastaŭ ad Hitlera nakaz pradstawić u Tokijo pierakanaŭča, što ntaresy Niamieččyny i Japonii ŭ SSSR supolnyja.

Kali Japonija zhodzicca na niamiecki prajekt, dyk u Berlinie hatowy pryznać aficyjalna Mandžuryju, a tak-ža zaklučyć niamiecka-japonski wajenny sajuz.

чатку, ад закладзінаў нават, учасьце студэнцкае ў працы было надта жывое.

Старарусы глядзелі варожа на арганізацыю „Просвіты“. Доказам гэных варожых адносінаў можа быць факт, што закладчыкам не хацелі нідзе адправіць у царкве набажэнства. Большасьць сьвяшчэньнікаў належала ў тую пару да старарусаў.

Каб заахвоціць упісывацца ў сябры новае арганізацыі, было пастаноўлена, што кожны з іх дастава́ціме дарма кніжачкі, якія „Просвіта“ будзе выдаваць рэгулярна, Практыка паказала, што мала выдаць кніжку, трэба яшчэ паруліцца, каб яны не прападалі, трэба памагчы сабраць іх у адным месцы. Дзеля гэтага прыступілі да наладжаньня чытальняў. І пачынаючы ад 1884 г. з паймом і дзейнасьцю „Просвіты“ стульна злучана праца ў чытальнях.

Жыцьцё і дамаганьні сяброў прымусілі „Просвіту“ заняцца праблемамі эканамічнымі. Мэта і статут таварыства растуць ушыркі. У адным з пазьнейшых статутаў сказана, што мэта: „асьвета ды ўздым культуры і заможнасьці украінскага народу“.. І толькі пасьляваенны зрэфармаваны статут пакідае на старане эканамічную дзялянку а цікуе выключна аб асьвеце і культуры духовай.

Пачаткі працы былі вельмі скромныя, бяручы яе са стараны магчымасьцяў грашовых. Дзеля прыкладу пакажу хаця-б на адно, што даўжэйшы час арганізацыя ня мела собскага памяшчэньня. На нарады ўправы сабіраліся ў прыватным памяшчэньні аднаго з сяброў управы. Вельмі характэрна, што ад пачатку моцна была падчыркнута ўсеукраінскасьць у мэтах, адтуль і заклік да запісі ў сябры да ўсіх украінцаў, дзе яны пражываюць. З першае адозвы бачым аднача́сна агульнае цяжкое становішча украінскага адраджэньня. І сяньня ня можам ня дзівіцца, які адзіны магчымы і слушны шлях выбралі тады лепшыя сыны народу ў свэей руплівасьці аб народнай справе. У вышменаванай першай адозве аўтары шукаюць прычынаў малога росту сьведамасьці, раўняючы хаця-б з 1848 г., пытаюцца, якая прычына цяжкое долі эканамічнае сялянскіх масаў і толькі адчасьці апраўдываюць гэта неспагаднымі вонкавымі ўмовамі. Большую віну бачаць у самым грамадзянстве, якое праяўляючы актыўна свой патрыятызм, гаварыла аб патрэбе збольшаньня свае інтэлігенцыі, аб абходнасьці закладзінаў свайго тэатру, аб дасягненьнях у плошчы літаратуры, аднак замала яно думала і цікавала аб агульнай шырокай працы асьветнай у масах, паміж сялянствам. Існуючыя тады народныя школы ня мелі падручнікаў. Масы не маглі ўзгадаваць сваіх павадыроў, дзеля нястачы духовага корму ў форме адпавядаючых кніжак, літаратуры. Дык ясна гаворыцца ў той адозве, што украінцы ў дробнай часьці ня зьдзейсьнілі таго, што зрабілі сэрбы, чэхі, якія ў працягу жыцьця аднаго пакаленьня і натугаю гэнага аднаго пакаленьня адрабілі цэлыя стагодзьдзі. Замалая руплівасьць у галіне найшырэйшае асьветы пагражала вынарадаўленьнем і вось у напрамку гэнае асьветнае працы накіравана ўся натуга арганізацыі.

Ці шмат трэба мне гаварыць, каб даказаць наскольні актуальнымі зьяўляюцца для нас, беларусаў, праблемы, якімі жылі закладчыкі „Просвіты“?! Не хачу і не магу крытыкаваць бяздзейнасьці нашае інтэлігенцыі. Гісторыя беларускае культуры ацэніць калісь як сьлед тое вялікае геройства нашага і мінаючага пакаленьняў за іхняе змаганьне якга за асьвету і актыўнае ўчасьце ў творстве культуры дзеля шырокіх масаў і пры помачы гэных самых шырокіх масаў. Затое не бяз жалю можна гаварыць аб тым, што ня ўся беларуская інтэлігенцыя, ня ўсе адзінкі, якія-б маглі, станулі на ўсім, здаецца, чутны заклік Бацькаўшчыны... „да працы!... усе на фронт культурна-асьветнае працы!“...

„Просвіта“ пачала зьдзейсьняць свае пляны выдаючы кніжкі і зразу ўзяла на свае плечы вялікую справу—падрыхтоўкі падручнікаў для адзінае на тую пару украінскае гімназіі. Дзякуючы захадам розных людзей, у першую чаргу дзякуючы спагадным адносінам паслоў-народнікаў Львоўскага парляманту таварыства дастала гадавую падмогу на свае выдавецтвы.

Шырокая плятформа працы ў „Просвіце“ гартавала людзей розных паглядаў на тактыку і украінскую палітыку. Гэную ўнівэрсальнасьць і беспартыйнасьць наглядаем красамоўна ў 1871 г., калі з ініцыятывы мітрапаліта Сэмбратовіча было пастаўлена пытаньне аб супольным фронце паміж старарусамі і украінцамі народнікамі. Цьвёрдае становішча „Просвіты“ дало ёй маральнае права ўзяць тады слова і заявіць, што старарусы заўсёды змогуць з імі дагаварыцца, калі стануць на шлях сапраўды агульна народны. Дык гэнае прадусім асьветнае таварыства ўзяло на сябе адчасьці ролю афіцыяльнага нацыянальнага прадстаўніцтва і сьцяг гэнага прадстаўніцтва трымае высока праз увесь далейшы час. Міністарыяльныя асьветныя ўлады ў Вене прызналі аўторытэт „Просвіты“, калі згодна з ейнымі дамаганьнямі завялі ў Мадзяршчыне па украінскіх школах падручнікі выданьняў „Просвіты“.

Адначасна „Просвіта“ шукае кантакту з прыдняпранскаю Украінаю, зорка сачыць за ўсімі падзеямі ў культурным агульна-славянскім жыцьці.

У нутраным краёвым жыцьці побач з працаю асьветнаю бярэ на сябе рэпрэзэнтацыйную ролю пры ўсякіх сьвяткаваньнях, прыкладам у чэсьць Шэўчэнкі, Шашкевіча, у дваццаць пятыя ўгодкі скасаваньня прыгону (1873 г.) і г. д. Дык, значыцца, „Просвіта“ бярэ на сябе павадырства ва ўсіх праявах нацыянальнага жыцьця ў Галіччыне.

Ня можам казаць, каб гэны давер грамадзянства быў апраўданы ад самага пачатку працаю ўжо зробленаю. Гэта толькі паказывае, што людзі сьвядома і несьвядома чулі правільнасьць шляху, занятага „Просвітаю“. І сяньня ніхто ня мог-бы нічога й у нас, беларусаў, дадаць да сказу аднаго з першых старшыняў „Просвіты“, калі той казаў, паклікаючыся на Монтэскіё, што культура кожная мераецца не багацьцем зямлі, а асьвечанасьцю грамадзян, што палітычным дзейнікам можа быць толькі асьвечаны чалавек. Або такі сказ таго-ж старшыні: „нам украінцам трэба тое ведаць, што столькі людзей здабудзем для асьветы, колькі з іх скажа, што іхняя зямля Украіна а яны самыя Украінцы... Толькі сваім собскім змаганьнем здабудзем належныя нам прывы.“

Roznyja wiestki

Z Ukrainskaj palityki. Treba adznačyć try fakty, jakija niadaŭna stalisia. Pieršy adnosicca da Zakarpaćcia. Českija dziaržaŭnyja palityki zadeklarawali aŭtanomiju dla h. zw. „Padkarpackaj Rusi." Heta aŭtanomija ŭžo daŭno zahwarantowana kanstytucyjaj; z dahaworam na aŭtanomiju zakarpackija Ukraincy zhadzilisia pryłučycca da Čechasławaččyny. Čechi hetaha dahaworu wykanać nie śpiašalisia, až pakul ukrainskaja prablema nia stała suświetnaj. Ciapier Čecham stała jasna, što lepš mieć Ukraincaŭ pryjacielaŭ čymś worahaŭ. Słowam, Čechasławaččyna nieachwotna pajšła na aŭtanomiju dla Ukraincaŭ. Ukraincy Zakarpaćcia damahajucca ŭłučeńnia ŭ aŭtanamičny abwod i sławianskich pawietaŭ, jakija ŭ bolšaści zasielenyja ukraincami. Čechi chočać mocna ahraničyć prawy dla Zakarpackaj ukrainskaj aŭtanomnaj ziamli; dziela hetaha ciapier wiaducca pierahawory.

Druhi fakt z ukrainskaj palityki— heta Kanhres Frontu Nacyjanalnaj Jednaści, jaki nadowiačy adbyŭsia ŭ Lwowie pry ŭčaści bolš 350 pradstaŭnikoŭ. Kanhres abazwaŭ swajho pawadyra i ideoloha F.N.I. red. Palijewa „pawadyrom ukrainskaj nacyi."

Ukrainskaja presa inšych kirunkaŭ piša, što ŭkrainskija sialanskija i rabotnickija masy trymajucca zdaloku ad partyjnaha padzielu, dyk nia treba raźličać, što hety Kanhres budzie mieć praktyčnyja naśledki.

Treci fakt — pastanowy centralnaha K-tu UNDO. Centralny K-t UNDO na swaim pasiedžańni pryniaŭ takija pastanowy, u jakich, miž inšym, skazana nastupnaje:

UNDO stojačy nieparušna na prahramie i ideolohičnych asnowach, pryniatych na ŭsich dasiulešnich partyjnych źjezdach, uważaje najlepšym sposabam da ździejśnieńnia swajho zadańnia apiorcisia na zarhanizawanyja i niezależnyja siły swajho narodu. C.K. UNDO uważaje, što normalizacyja ukrainska-polskich suadnosinaŭ była-b patrebnaj i karysnaj, kali-b jana wiarnuła stračanyja ad 1919 h. i nabytyja ciažkaj pracaj celaha ukrainskaha narodu prawy wa ŭsich halinach žyćcia.

Z POLŠČY

Z Uradu. Radaj Ministraŭ apošnimi časami pastanoŭlena:

—zarhanizawać ahulny kamitet pomačy biezrabotnym;

— wydać zakon ab zarhanizawańni dziaržaŭnaha instytutu kultury wioski.

—Urad wydaŭ specyjalny śpis dwaroŭ i falwarkaŭ, jakija padlahajuć prymusowamu wykupu i parcelacyi ŭ ahulnaj płoščy 27.000 hektaraŭ.

—Ministar Skarbu wydaŭ rasparadžeńnie, kab nadpłačanyja padatki zwaročwali płatnikam hrašmi.

Sesija Sojmu. Waršaŭskaja presa padaje, što sioletniaja budžetnaja sesija Sojmu, jakaja pačniecca ad 1 listapada, nia budzie adkładacca, jak heta bywała ŭ prošłyja hady. Pryhetym hazety dadajuć, što heta maje być sprobaj uzmocnić aŭtorytet ciapierašniaha Sojmu.

Abiadnieńnie sialanstwa. Statystyka padaje, što ŭ pieršym paŭhodździ 1936 h. konsumcyja sialanstwa pramysłowych praduktaŭ amal na paławinu była mienšaj ad konsumcyi ŭ 1928 h.

Ziemlarobskija arhanizacyi adznačajuć, što poruč z źmianšeńniem konsumcyi pradukcyi pramysłowaj źmianšajecca spažyćcio pradukcyi ahułam siarod sialanstwa.

Hod 1936 byccam prynios paprawu ŭ ziemlarobstwie, ale henaja „paprawa" nie raźwiazwaje matarjalnaha pałažeńnia sialanstwa.

„Legjon Młodych." Wialikija afišy na muroch 18 haradoŭ 27.IX. sklikali narod na wieča, arhanizawanaje sanacyjnaj arhanizacyjaj „Legjon Młodych." Wiečy adbylisia, ale niamnohaludnyja. Na wiečach hawaryli ab patrebie pierabudowy nutranoha ładu ŭ Polščy. Dakazwali, što kapitalistyčny ład treba źmianić, bo jon niesprawiadliwy i bazujecca na abmanie.

Ahułam, na hetych wiečach šmat ab čym hawaryli, ale ab tym, što ŭ Polskaj dziaržawie jość biełarusy, ukraincy, litoŭcy i inšyja nac. mienšaści i ab patrebach hetych narodaŭ, nichto ni słowa nie skazaŭ. Słowam, u „radykalnym" polskim „Legjonie Młodych" sprawa nacyjanalnych mienšaściaŭ u Polščy nia isnuje. Miž „Leg. Mł." i endecyjaj u hetaj sprawie roźnicy niama.

Z ZAHRANICY

Liha Narodaŭ. Paśla pryznańnia zakonnym pradstaŭnictwa ŭ Lizie ad Abisynii wydelehawanaha nehusam Heile Selasijem, u Lizie adbywajucca narady biaz učaścia Italii. Nia pryjmaje ŭčaścia ŭ naradach Lihi tak-ža i Niamieččyna, jakaja wystupiła z Lihi prad raspačaćciem łamańnia Hitleram Wersalskaha traktatu.

Na ciapierašniaj sesii Lihi Narodaŭ taksama, jak na sesijach papiarednich, usio haworać ab zabiaśpiečańni miru. U hetaj sprawie wielmi sprytna wystupaje pradstaŭnik SSSR, kamisar zahraničnych spraŭ Litwinaŭ, jaki, choć i nie nazywajučy pa imieni, wyrazna pakazwaje, što niebiaśpieka wajny znachodzicca ŭ wajaŭničych nastrojach hitleraŭskaj Niamieččyny.

Bratabojčaja wajna ŭ Hišpanii. Najzajadlejšyja wojny bywajuć nutranyja, dzie praciŭniki starajucca biaźlitasna źniščyć adny druhich. Ab usich strachoćciach sučasnaj bratabojčaj wajny ŭ Hišpanii apisać prosta niama sposabu. Dziela hetaha my ahraničwajemsia ahulnymi wiestkami.

Apošnimi časami paŭstancy pačali pieramahać respublikanskaje wojska. Z pryčyny hetaj pieramohi hien. Franko ŭžo abwieščany fašystymi načalnikam Hišpanii.

Pryhetym treba adznačyć, što hišpanskija fašysty nia chočać ušanawać imknieńni da samastojnaha bytu ani Kataloncaŭ ani Baskaŭ i ichnyja pryrodnyja prawy hwałciać aružnaj siłaj.

Japonija padymaje wajnu ŭ Kitai. Tak, jak padbiła sabie abisynskija prawincyi Italija, taksama Japonija starajecca padbić sabie niekatoryja prawincyi Kitaju. Z hetaj pryčyny ŭ Kitai ŭściaž pahražaje wajna z Japonijaj.

Treba adznačyć, što Japonija pastupowa załazić uhłyb Kitaju i tam damahajecca ad kitajskich uładaŭ sabie prawoŭ. Apošnimi časami kitajcy pačali mocna spraciŭlacca japonskaj nachabie i heta stała pahražać tam wajnoj.

Źmiena kamisaraŭ u SSSR. Apošnimi časami adbylisia źmieny narodnych kamisaraŭ u SSSR. Dasiulešni kamisar nutranych spraŭ (GPU) Jahoda abniaŭ niepalityčnaje ministerstwa — naznačany kamisaram pošt i telehrafaŭ. Kamisaram nutranych spraŭ naznačany Michail Ježow — sakratar centr. k-tu kompartyi SSSR.

Rykow — dasiulešni kamisar pošt i telehrafaŭ pajšoŭ u adstaŭku.

Z WILNI

Pasiedžańnie Lit. Nac. K-tu 24.IX siol. adbyłosia pasiedžańnie Litoŭskaha Nacyjanalnaha Kamitetu, na jakim było abhaworwana sučasnaje pałažeńnie litoŭskaha narodu ŭ Polščy.

Litoŭskaja delehacyja ŭ wajawody. 15.IX pradstaŭniki Litoŭskaha Nacyjanalnaha Kamitetu: Ks. K. Čybiras i W. Budrewič adwiedali Wilenskaha Wajawodu, šyroka jamu pradstawiŭšy kulturnaje litoŭskaje pałažeńnie i prasili, kab wajawoda admianiŭ zahady miascowych uładaŭ, jakija pazakrywali ichnija miascowyja tawarystwy. Wajawoda wysłuchaŭ i prasiŭ kab usio heta jamu padali na papiery.

Грамадзяне! Запісвайцеся ў Беларускае Народнае Аб'еднаньне!

Пісьмы з вёскі

Нашыя весткі.

Уселюб, Навагрaдзкага пав. Пачаўся школьны год — дзеці зьбіраюцца ў школы, разумеецца, у польскія. Клопатаў бацьком многа, а карысьць ці будзе якая — няведама. З прычыны незразумелай мовы, у якой вучаць нашых дзяцей у польскіх школах, паўстае і недавер да вучыцеля, бо за непаразуменьне між вучнямі і вучыцелем адказвае заўсёды вучыцель.

Патрэба роднае школы вялікая, але праявіць актыўнасьць падаваньня дэкляpацыяў за беларускую школу ня ўсюды можна — пасыўнасьць у тэтай справе нашага сялянства гэта віна не адных сялян.

Другая, ня менш прыкрая, зьява ў нашым жыцьці — гэта несарганізаванасьць. Але і тут пасыўнасьць сялянскай моладзі апраўдываецца вонкавымі абставінамі. Польскія арганізацыі — гэта толькі непатрэбны гумар для нашай моладзі: езьдзяць па вёсках інструктары гэтых арганізацыяў, нагаварваюць моладзь у свае рады, але гэта сухі гарох аб сьцяну; цяпер стараюцца заснаваць у нас „Звёнзак Дробнэго Рольніка". Якая гэта арганізацыя і каму яна патрэбна — ня ведама.

Нашыя людзі хочаць сваей арганізацыі — арганізацыі беларускай, у якую ахвотна пойдуць усе. Пара закладаць у нас беларускія арганізацыі і даць ім магчымасьць свабодна разьвівацца.

Сёлета ў нашай ваколіцы вельмі шмат нарабілі шкоды пяруны. Трэба стаўляць пярунахроны. Гэтай справай павінен заняцца сельскі самаўрад.

Цяпер крыху з жыцьця рэлігійнага: ёсьць у нас К. С. М. — гэта значыць „Каталіцкае Стоважышэне Моладзі;" сяброўка гэтай арганізацыі сьпярша была агітатаркай антысэмітызму, а пасьля украла каптан.

Да праваслаўных сёлета прыяжджаў архіяпіскап Антоні. Прыяжджаў ён надта пышна, быццам ангельскі лёрд, прымалі яго дастойна паветавы староста, войт і паліцыя. Да народу гаварыў ён незразумела, парасейску.

Нашым праваслаўным патрэбная ў царкоўна-рэлігійным жыцьці родная, беларуская мова; патрэбна беларуская мова і ў касьцеле для беларусаў-каталікоў.

Вялікая бяда і ў сялянскіх гаспадарках — малазямельле не пазваляе разьвіць гаспадарку. Няма ў ваколіцы ніякай належнай вэтэрынарнай помачы. Жывёлу лечаць знахары.

Настрой нашага сялянства часовы — усе чакаюць нейкай перамены і ніхто не баіцца вайны.

А. Д.

Дух няволі.

Краглі, Баранавіцкага пав. Мы ўсе праваслаўныя, але ў царкву мала хто з нас ходзіць. Сьведамасьці нацыянальнай у нас няма. Найбольш уважаюць сябе „рускімі". Нацыянальна сьведамыя у нас толькі лічаныя адзінкі. Яны выпісываюць газэту „Беларуская Крыніца".

Школьнай акцыяй нашыя сяляне ня цікавяцца,як і агулам нічым ня цікавяцца.

Ёсьць у нас малачарскі коопэратыў, але сяляне іўім ня цікавяцца.

Дзеці нашыя вучацца ў польскай школе і, ведама, нічога ня могуць навучыцца. Сяляне наракаюць на польскую школу і хваляць даўнейшую школу расейскую.

Прасьветнай працы ў нас няма ніякай.

Мне здаецца, што залажыўшы рукі назад ня можна на гэта глядзець, але трэба несьці сьвятло ў хату нашага селяніна. Мы тут усе беларусы, гаворым толькі пабеларуску і маем беларускія звычаі. Дзеля гэтага да нашых сялян трэба йсьці з сьвятлом навукі пабеларуску. Трэба пашыраць беларускія газэты, трэба прывучаць чытаць беларускія кніжкі і журналы.

Сьведамейшыя адзінкі! Вашым народным і грамадзкім абавязкам ёсьць усьведаміць нашых сялян і паказаць ім шлях з духовай няволі да лепшай і сьвятлейшай будучыні.

К.

Нашая бяспрыкладнасьць.

Маладэчна. Цяжка жывецца нашаму, беларускаму сялянству, але гэтаму вінаваты і самі сяляне. За прыкладамі хадзіць далёка ня трэба.

Ёсьць у нас Каса Стэфчыка. Каса мае каля 800 сяброў, большасьць якіх становяць малазямельныя беларускія сяляне, рэшта — чыноўнікі. На сёлетняе агульнае сабраньне сяброў Касы прыбыло толькі 42 і то ў большасьці чыноўнікі. Сяляне на сход не зьявіліся. Адбываліся выбары рады Касы і, ведама, выбрана яна з людзей, што цікавяцца справай Касы і прыходзяць на сходы; з гэтых людзей выбрана так-жа і ўправа Касы. Такім чынам паямі большасьці беларускіх сялян гаспадарыць у Касе чынавецкая меншасьць.

Скарбнікам Касы ёсьць польскі асаднік Дабравольскі, які з сялянамі гаворыць толькі „ужэндова".

Рахункаводам у Касе ёсьць б. чыноўнік магістрату Янка Сыракваш. Старшынёй управы Касы — чыноўнік староства.

Трэба ведаць, што нашая Каса лічыцца земляробскай, але ў кіраўніцтве яе сядзяць зусім незямляробы.

Праўда, ёсьць у радзе Касы і некалькі сялян, але яны агульнымі справамі так цікавяцца, што нават і сваіх газэт ня хочаць чытаць.

Дык вось якія рэзультаты сялянскай нядбайласьці. Каб на сход зыйшлося не 42, а прынамсі 342 сябroў Касы, дык і рада і ўправа былі-б іншыя. Як бачым, дык у гэтым нашая віна.

Браты сяляне, старáймася свае грамадзкія абавязкі выконваць сумленна і дзе трэба быць, каб падаць свой голас у сваей-жа грамадзкай справе, трэба там бываць і трэба бараніць сваіх інтарэсаў.

Папулька.

„Nie pakidajcie rodnaj mowy, kab nia ŭmiorli!"

U Charoščy probašč starajecca parachwiju wiaści papolsku, jak i ŭsiudy hetak robiać ksiandzy. My ŭsie piajem i molimsia tolki papolsku. Kala Charoščy ludzi mała dumajuć pra toje, što malicca i piajać možna pabiełarusku hetaksama dobra, jak i papolsku. A kab chto hetak padumaŭ, dy jašče ab hetym skazaŭ što hołasna, tady-by jon dastaŭ-by dobra ad swajho probašča, bo bajawy naš probašč! Jak našy ludzi wyjduć z kaścioła, dyk na ćwintary i na rynku wielmi starajucca miž saboj hawaryć papolsku. A jak kamu wypstryknіecca jakoje słowa pabiełarusku, tady jon na baki ahladajecca i baicca, ci nie pačuŭ jaho chto. Bo jak-ža hawaryć paprostu, pabiełarusku — u miastečku, dy pry kaściele — na heta ŭ našych ludziej niama adwahi. Ale zdarajecca i tut, što kabiecina jakaja, zabyŭšysia na ŭsio, hołasna dawaj hawaryć pabiełarusku. Hena jaje biełaruskaja hutarka tady dla ŭsich ludziej tut miłe i na hetakuju kabiecinu z sympatyjaj hladziać tady ludzi.

Z biełaruskaj mowaj najbolš pakryŭdžanyja ŭ nas dzieci. Hawaryć pabiełarusku dzieciam u nas zabaraniajecca. Jak heta robicca, dyk na't i cikawa. Dzieci na baćkoŭ hladziać i dziwiacca i nie razumiejuć taho—čamu heta, kali ich baćki miž saboj pabiełarusku haworać, to im u hetaj mowie da baćkoŭ i miž saboj hawaryć nia možna? Ahułam kala Charoščy taki duch, kab dziaciej nachilać da polskaj mowy i nie pazwalać im na't z baćkami hawaryć pabiełarusku. Hety duch u nas starajucca padtrymać polskija „kulturtrehiery". Z hetym nam treba zmahacca, biaručysia achwatniej za ŭsio swajo, što biełaruskaje.

Ch.

Redaktar A. Dasiukiewič — Biełaruskaja Drukarnia im. Fr. Skaryny ŭ Wilni, Zawalnaja 1 — 2. — Wydawiec A. Šutowič